# Гісторыя школ мікрараёна

У *1862*г. у в. Райца адкрыта сельская прыхадская школа. У *1890*г. адкрыта народнае вучылішча. Настаўнікамі працавалі ў пачатку *90*-х гадоў Надзея Сцяпура, Міхаіл Маруціч, у *1909-1917*г. – Фёдар Навумовіч.

Існавала польская пачатковая *5*-класная школа. У *1930-31* навучальным годзе ў ёй займаўся *191* вучань. У другой палове *20*-х гадоў у школе ўведзена вывучэнне беларускай мовы, але да сярэдзіны *30*-х гадоў было спынена.

У *1909*г. у в. Міратычы адкрыта народнае вучылішча. Першая настаўніца Зінаіда Іваноўская працавала да *1917*г. З *1921-1939*г. у вёсцы існавала польская пачатковая школа, размешчаная ў дзвюх сялянскіх хатах(Маркевіч Павел, Карчык Іосіф) У *1930-31* навучальным годзе ў ёй займалася *111* вучняў. *3* верасня *1939* года была адчынена пачатковая школа, у якой прадметы выкладаліся на беларускай і рускай мовах. настаўнікі: Абухоўскі Барыс (прысланы з Расіі), Каралько Арсень Іосіфавіч (мясцовы). Гэта школа працавала да пачатку Вялікай Айчыннай вайны. У *1940*г. в Міратычы стала цэнтрам сельсавета Валеўскага (Карэліцкага) раёна. Школа пераведзена на беларускую мову навучання. У *1941-44*г. працавала пачатковая школа. Прадметы выкладаліся на нямецкай, лацінскай, беларускай мовах. Настаўнікі: